■ Спорт-тайм

# НАШЫ ТЭНІСІСТЫ ІДУЦЬ ДАЛЕЙ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» расказвае пра перамогу беларускіх тэнісістаў у Кубку Дэвіса, магчымых сапернікаў беларускіх клубаў у футбольных еўракубках і сенсацыйнае паражэнне БАТЭ.**

**1. Беларускія тэнісісты перамаглі ў матчы Кубка Дэвіса** другога раўнда 2-й Еўра-Афрыканскай групы сапернікаў з Турцыі з агульным лікам 3:2 і выйшлі ў наступны этап турніру. Усё вырашылася ў пятым матчы сустрэчы, дзе згулялі Кім Ількел і Ягор Герасімаў. Наш суайчыннік змог атрымаць перамогу ў чатырох партыях — 3:1 (6:2, 7:6, 3:6, 7:6).

У верасні зборная Беларусі сустрэнецца з сапернікамі з Партугаліі, якія напярэдадні абыгралі фінаў.

**2. Адбыліся матчы 1/16 фіналу Кубка краіны па футболе,** якія напалову завяршылі праграму гэтай стадыі. Мінскае «Дынама» перайграла «Смалявічы» — 2:0, «Шахцёр» разграміў «Слонім» — 10:1, жодзінскае «Тарпеда-БелАЗ» упэўнена ўзяло верх над «Оршай» — 5:0, а БАТЭ сенсацыйна саступіў «Спартаку» са Шклова — 1:2. Вынікі астатніх сустрэч: «Ашмяны» — «Граніт» — 1:3, «Дынама» Брэст — «Бяроза-2010» — 3:1, «Кобрын» — «Гомель» — 0:2, «Крумкачы» — «Слуцк» — 2:2, «Гарадзея» — «Мінск» — 0:0, «Ліда» — «Смаргонь» — 0:2, «Рэчыца-2014» — «Нёман» — 0:0, «Хімік» — «Ісклач» — 0:2, «Хваля» — «Віцебск» — 1:3, «Гомельчыгункатранс» — «Белшына» — 1:2, «Баранавічы» — «Славія» — 1:1, «Днепр» — «Нафтан» — 0:4.

Уладальнікі пуцёвак у 1/8 фіналу вызначацца па выніках двух матчаў. Паядынкі ў адказ пройдуць 1 і 2 жніўня.

**3. Беларускія футбольныя клубы БАТЭ, «Дынама» (Мінск) і «Шахцёр» (Салігорск) даведаліся пра верагодных сапернікаў** па трэцім кваліфікацыйным раўндзе Лігі чэмпіёнаў УЕФА і Лігі Еўропы сезона 2015/16, з якімі яны будуць змагацца пры ўмове пераходу на наступны этап.

Барысаўскі БАТЭ ў выпадку выйгрышу ў ірландскага «Дандолка» па суме двух матчаў сустрэнецца з мацнейшай камандай з пары «Нью-Сэйнтс» (Лансантфрэйд, Уэльс) — «Відэатон» (Секешфехервар, Венгрыя). Нагадаем, БАТЭ на сваім полі ў першым паядынку выйграў у «Дандолка» — 2:1. Матч у адказ 2-га кваліфікацыйнага раўнду беларусы згуляюць 22 ліпеня ў Дандолку.

Калі другі кваліфікацыйны раўнд пераадолее мінскае «Дынама» ў Лізе Еўропы, то яго наступным сапернікам будзе швейцарскі «Цюрых», які атрымаў прамую пуцёўку ў гэтую стадыю. Напярэдадні «бела-сінія» згулялі ўнічыю з балгарскім «Чорна Мора» — 1:1.

З дортмундскай «Барусіяй» можа сустрэцца ў 3-м кваліфікацыйным раўндзе Лігі Еўропы салігорскі «Шахцёр». Гарнякі наўдала правялі першы хатні матч другога раўнда супраць аўстрыйскага «Вольфсберга» — 0:1.

«Дынама» і «Шахцёр» паядынкі ў адказ правядуць 23 ліпеня.

**4. Плывец Ігар Бокій выйграў чатыры залатыя медалі на чэмпіянаце свету па плаванні сярод паралімпійцаў.**



Беларус на сусветным форуме ў Глазга стаў пераможцам на дыстанцыях 400 м вольным стылем, 50 м вольным стылем, 200 м комплексным плаваннем, а таксама 100 м на спіне.

**5. Міжнародная федэрацыя хакея апублікавала расклад 80-га чэмпіянату свету,** які пройдзе з 6 па 22 мая 2016 года ў расійскіх Маскве і Санкт-Пецярбургу. Нацыянальная зборная Беларусі адкрые турнір матчам супраць каманды Фінляндыі.

6 мая. Беларусь — Фінляндыя (пачатак у 20.15).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.05 | 21.28 | 16.23 |
| Віцебск — | 4.48 | 21.24 | 16.36 |
| Магілёў — | 4.55 | 21.16 | 16.21 |
| Гомель — | 4.59 | 21.14 | 16.15 |
| Гродна — | 5.12 | 21.16 | 16.04 |
| Брэст — | 5.30 | 21.34 | 16.04 |

**Месяц**

*Першая квадра 24 ліпеня.*
*Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Тацяны, Аляксандра, Дзмітрыя.*
***К.*** *Андрэя, Віктара, Данеля.*



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

## ЗАЎТРА




...у суседзяў

| | |
|---|---|
| ВАРШАВА | +26..+28°C |
| ВІЛЬНЮС | +21..+23°C |
| КІЕЎ | +28..+30°C |
| МАСКВА | +21..+23°C |
| РЫГА | +20..+22°C |
| С.-ПЕЦЯРБУРГ | +17..+19°C |

Даты | Падзеі | Людзі — **21 ЛІПЕНЯ**

**1897** год — нарадзіўся (Гродзенская губерня) Васіль Данілавіч Сакалоўскі, вядомы савецкі ваенны дзеяч, Герой Савецкага Саюза (1945), Маршал Савецкага Саюза (1946). У Чырвонай Арміі з 1918 года. Удзельнік грамадзянскай вайны (1918-1920). У 1930-1935 гадах — камандзір дывізіі Беларускай ваеннай акругі, затым — у іншых ваенных акругах. У гады Вялікай Айчыннай вайны (з ліпеня 1941 года): начальнік штаба Заходняга фронту, камандуючы войскамі Заходняга фронту, начальнік штаба 1-га Украінскага, намеснік камандуючага войскамі 1-га Беларускага франтоў. Удзельнік распрацоўкі Смаленскай аперацыі (1943) і Віцебска-Аршанскай аперацыі (1944). Пасля вайны — намеснік галоўнакамандуючага, галоўнакамандуючы Групай савецкіх войскаў у Германіі. З 1949-га — 1-ы намеснік ваеннага міністра, у 1952-1960 гадах — начальнік Генштаба — 1-ы намеснік міністра абароны СССР. Памёр у 1968 годзе. У Гродне імем В.Д. Сакалоўскага названа вуліца і ўстаноўлены бюст.

**1915** год — у Мінску было створана Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, дабрачынная арганізацыя для аказання дапамогі



бежанцам 1-й сусветнай вайны. Арганізоўвала пункты харчавання, сталовыя, інтэрнаты, аказвала медыцынскую дапамогу бежанцам. Адкрыла Мінскі аддзел Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны, аддзелы ў Дзісне, Вілейцы, Празароках, Друскеніках, Полацку і інш. Групавала вакол сябе дзеячаў беларускага нацыянальнага руху, было прадстаўніком нацыянальных інтарэсаў беларускага народа перад германскімі акупацыйнымі войскамі. Праводзіла культурна-асветніцкую працу, стварыла школьную камісію. У 1915-м адкрыла першую беларускую пачатковую школу ў Вільні, у 1916-м — 5 беларускіх школ (больш за 200 вучняў). У 1917-1918 гадах у Гродзенскай, Віленскай, Сувалкскай і акупаваных германскімі войскамі паветах Мінскай губерні адкрыла 153 беларускія пачатковыя школы. У канцы 1916 года ў мястэчку Свіслач пачала працу беларуская настаўніцкая семінарыя. У 1917 годзе камітэт таварыства арганізаваў 2 дзіцячыя прытулкі. З канца 1918 года ў сувязі з ускладненнем ваеннай і палітычнай сітуацыі на Віленшчыне дзейнасць таварыства пачала згортвацца.

**1969** год — чалавек упершыню ступіў на паверхню Месяца. Ім стаў Ніл Армстронг, камандзір амерыканскага карабля «Апалон-11». Вядомая яго фраза, якую ён сказаў, ступіўшы на Месяц: «Гэта адзін маленькі крок для чалавека, але гіганцкі скачок для ўсяго чалавецтва». Экіпаж карабля складаўся з трох астранаўтаў. Экспедыцыя не мела даследчых задач, мэта яе была простая — здзейсніць пасадку на спадарожніку Зямлі і паспяхова вярнуцца назад. Модуль зрабіў пасадку ў Моры Спакою ў 20 гадзін 17 хвілін па Грынвічы. Армстронг спусціўся на паверхню Месяца праз пяць гадзін, праз некаторы час да яго далучыўся Олдрын. Камера, усталяваная звонку модуля, транслявала выхад касманаўтаў на паверхню Месяца. Астранаўты сабралі неабходную колькасць матэрыялаў, размясцілі прыборы і ўстанавілі тэлевізійную камеру, а таксама амерыканскі сцяг (як вядома, Кангрэс ЗША адхіліў прапанову НАСА ўсталяваць на Месяцы сцяг ААН) і правялі сеанс сувязі з прэзідэнтам Ніксанам. Астранаўты пакінулі на спадарожніку памятную таблічку са словамі: «Тут людзі з планеты Зямля ўпершыню ступілі на Месяц. Ліпень 1969-га новай эры. Мы прыйшлі з мірам ад імя ўсяго Чалавецтва».

**Было сказана**

**Алесь БАЧЫЛА, паэт, драматург:**
*«Што можаш здзейсніць — неадступна здзейсні, каб не пякла агнём цябе віна».*

## Азбука народнай культуры

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

ПАЦУК. У народнай свядомасці пацук заўсёды быў звязаны з нячыстай сілай і ведзьмакамі. З павадзінамі пацукоў народ звязваў шэраг прыкмет і прадказанняў:

◈ Нельга граць на музычным інструменце ўначы — у хаце з'явяцца пацукі.

◈ Калі пацукі сышлі з хаты — здарыцца пажар, павадак або якое-небудзь іншае няшчасце.

◈ Калі пацукоў з'явілася вельмі шмат і яны знішчалі збожжа, якое захоўвалася ў клеці, гэта прадказвала голад і няўрод.

◈ Паўсюдна і сёння ведаюць, што цяжарнай жанчыне нельга адмаўляць у якой-небудзь просьбе, інакш гаспадарку таго, хто адмовіў, апануюць пацукі.

◈ Лічылася, што той, каму пацукі пагрызуць адзенне ці абутак, хутка памрэ.

◈ Жанчынам забаранялася браць у рукі пацука ці забіваць яго — хлеб ад такіх рук ніколі не паднімецца і будзе нясмачным.

◈ Калі пацуковыя гнёзды знаходзіліся побач з жытнёвымі палеткамі, гэта прадказвала сырое, дажджлівае надвор'е.

◈ Калі пацуковых гнёздаў было шмат на льняным полі, чакалі зіму з вялікім снегам.

Існаваў шэраг абрадаў і магічных дзеянняў, якія перасцерагалі (ахоўвалі) гаспадарку ад гэтых шкоднікаў:

◈ Для пазбаўлення ад іх хату абыходзілі з велікодным ежай, а па кутах клалі шалупінне ад асвячоных яек ці маленькія кавалачкі асвячонай просвіркі.

◈ Ніколі не згадвалі пацукоў за ежай.

◈ Калі пачыналі звозіць з поля снапы, то для пацукоў на бок клалі першы сноп, які прынеслі ў свіран, і пакідалі крыху зерня на возе. Такі «падарунак» даваў надзею на тое, што сам ураджай застанецца некранутым.

◈ Пад снапы як абярэг ад пацукоў падкладвалі «калядны» венік, альховыя галінкі ці галінкі бузіны.

Дарагую мамачку і бабулю
**Марыю Канстанцінаўну БЫЛІНУ**
з вёскі Драздоўшчына Стаўбцоўскага раёна шчыра віншуем з 75-годдзем! Зычым табе, наша любая, родная, моцнага здароўя і бадзёрасці, поспехаў, дабрабыту і яшчэ шмат шчаслівых гадоў жыцця — поруч з мужам Мар'янам Канстанцінавічам.
**З павагай і любоўю — дзеці, унукі.**



## УСМІХНЕМСЯ

**Як зарабіць пры дапамозе інтэрнэту ўсяго ў два крокі:**
**1. Адключаем інтэрнэт.**
**2. Пачынаем працаваць.**

— Люся, ты Ціхі акіян ведаеш?
— Так, Сёма.
— Дзеля цябе супакоіў.

**— Тата, а тата! А для чаго табе патрэбна мама?**
**— Для чаго, для чаго... Каб жыццё мёдам не здавалася!**

— Танечка, давай застанемся сябрамі...
— Не, толькі вяселле.

**Сустракаць блуднага мужа з качалкай у руках — мінулае стагоддзе. Яйцарэзка — вось выбар сучаснай жанчыны!**

Дзед-падабцаснік схапіўся за сэрца, але строгі погляд жонкі прымусіў яго пражыць яшчэ дваццаць гадоў.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.569. Індэкс 63850. Зак. № 2863.
Нумар падпісаны ў 19.30 20 ліпеня 2015 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12